А.І. БУЧА

## НЕВЯДОМЫ СЮЖЭТ З ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ: БЕЛАРУСКІ НАСТАЎНІЦКІ ІНСТЫТУТ У ПРАЗЕ (1922–1923)

Исследуется вопрос о попытках создания в Праге Белорусского учительского института, показывается деятельность белорусской диаспоры в Чехословакии по организации белорусского образовательного учреждения за границей, выявляются причины, обусловившие нереализованность данного проекта.

This article is devoted to the review of attempts to built in Prague Belarusian teachers' institute, describes the activities of the Belarusian Diaspora in Czechoslovakia on the organization of the Belarusian educational institution abroad, identifies the reasons for the lack of implementation of this project.

Чэхаславакія з'яўлялася адным з найбольш уплывовых і значных цэнтраў беларускай палітычнай эміграцыі міжваеннага перыяду. Па ініцыятыве прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў гэтай краіне былі створаны і паспяхова дзейнічалі шматлікія грамадска-палітычныя і культурныя арганізацыі, навукова-даследчыя інстытуцыі, а таксама была наладжана выдавецкая дзейнасць. Розным праявам жыцця беларускай дыяспары ў Чэхаславацкай рэспубліцы (ЧСР) прысвечаны даволі змястоўныя працы як айчынных[1], так і замежных аўтараў[2]. Але па-за ўвагай даследчыкаў застаўся вельмі цікавы сюжэт з жыцця беларусаў у Чэхаславакіі, які тычыцца дзеянняў па пераўтварэнню Прагі ў культурна-адукацыйны цэнтр беларускай эміграцыі. У дадзеным артыкуле будзе праведзена рэканструкцыя падзей, звязаных са спробамі па заснаванню Беларускага настаўніцкага інстытута, а таксама вызначаны прычыны, якія не дазволілі рэалізаваць гэты амбіцыйны і запатрабаваны для свайго часу праект. Асноўную крыніцазнаўчую базу прапанаванай працы складаюць ліставанне М. Вяршыніна з П. Крэчэўскім, Т. Грыба з П. Крэчэўскім, В. Ластоўскім, А. Луцкевічам, У. Жылкам, Я. Станкевіча з В. Ластоўскім за 1922–1925 гг. Матэрыялы з фондаў Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі[3] упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.

У адносінах да эміграцыі з былой Расійскай імперыі чэхаславацкімі ўрадавымі коламі была выпрацавана адмысловая праграма «Руская акцыя». Кампанія падтрымкі эміграцыі ажыццяўлялася пад кіраўніцтвам Міністэрства замежных спраў (МЗС) ЧСР. «Руская акцыя» праводзілася ў адпаведнасці са знешнепалітычнай канцэпцыяй ЧСР, якая базавалася на меркаваннях аб нетрываласці бальшавіцкай улады і непазбежным пераўтварэнні Расіі ў дэмакратычную краіну. Таму рабілася стаўка на падрыхтоўку з асяроддзя эміграцыі прафесійных і навуковых кадраў для будучай Расіі[4]. Па гэтай прычыне істотным складнікам «Рускай акцыі» з'яўлялася накіраванасць на падтрымку акадэмічнай, навуковай, педагагічнай і даследчай дзейнасці ў асяроддзі эмігрантаў[5].

Адным са шляхоў увасаблення дадзенай устаноўкі стала стварэнне эмігранцкіх вышэйшых навучальных устаноў (ВНУ) у Чэхаславакіі. На працягу 1921–1923 гг. у ЧСР былі створаны наступныя расійскія і ўкраінскія ВНУ: Украінскі вольны ўніверсітэт, Рускі інстытут сельскагаспадарчай кааперацыі, Украінская гаспадарчая акадэмія, Рускі юрыдычны факультэт, Рускае вышэйшае вучылішча тэхнікаў шляхоў зносін, Украінскі вышэйшы педагагічны ўніверсітэт імя М. Драгаманава, Рускі педагагічны інстытут імя Яна Амоса Каменскага, Рускі інстытут камерцыйных ведаў, Рускі народны ўніверсітэт.

У прадстаўленым спісе адсутнічае Беларуская вышэйшая школа, хаця ў гэтым накірунку «пражскія» беларусы правялі даволі грунтоўную працу. Чаму беларускія спробы па арганізацыі БНІ не мелі поспеху? Адказ на гэта пытанне паспрабуем знайсці, прааналізаваўшы некаторыя моманты жыцця беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1922–1923 гг.

Фарміраваная ў асноўным за кошт заходнебеларускай моладзі, беларуская дыяспара лічыла Чэхаславакію месцам часовага знаходжання, а духоўна была заангажавана ў заходнебеларускі кантэкст, не застаючыся разам з тым па-за падзеямі, якія адбываліся ў Савецкай Беларусі.

Разуменне сітуацыі, звязанай з беларускім школьніцтвам у Заходняй Беларусі, з аднаго боку, – фактычная недаступнасць вышэйшай асветы для амаль двухмільённай беларускай меншасці ў Польшчы, а з другога – надзённая патрэба ў канструяванні нацыянальнай эліты, здольнай супрацьстаяць польскай асіміляцыйнай палітыцы, выкрышталізавала ў беларускім асяроддзі канцэпцыю пераўтварэння Прагі ў «цэнтр па накапленню культурных вартасцяў беларускага адраджэнскага руху»[6]. Адным з асноўных элементаў гэтага меркаванага «пражскага беларускага культурнага цэнтра» павінен быў стаць Беларускі настаўніцкі інстытут (БНІ), арыентаваны на падрыхтоўку педагагічных кадраў для Заходняй Беларусі.

У канцы 1922 г. па ініцыятыве Т. Грыба і Я. Мамонькі быў падрыхтаваны праект БНІ. Прадугледжвалася стварыць інстытут на 40 слухачоў (стыпендыі павінны былі б прызначацца Беларускай грамадзе) з наступным выкладчыцкім складам – А. Галавінскі, Л. Заяц, К. Душэўскі[7]. Старшыня Беларускай грамады М. Вяршынін прыняў прапанаваны беларускімі студэнтамі праект інстытута і пачаў весці ў гэтай справе перамовы з прадстаўнікамі МЗС ЧСР.

Паралельна з распрацоўкай праекта інстытута Т. Грыб звярнуўся да П. Крэчэўскага і прапанаваў апошняму пераехаць у Прагу. Т. Грыб разумеў, што справа арганізацыі інстытута будзе мець поспех толькі тады, калі яе прасоўваннем зоймецца сапраўды аўтарытэтная асоба, з якой будуць лічыцца афіцыйныя ўлады. Менавіта на гэту ролю лепш за ўсё падыходзіў П. Крэчэўскі, які пасля Нацыянальна-палітычнай нарады (верасень 1921 г.) застаўся ў Празе і прабыў там да лета 1922 г. За гэты час П. Крэчэўскі ўстанавіў кантакты з чэхаславацкімі ўрадавымі коламі, а таксама з прадстаўнікамі расійскай і ўкраінскай дыяспар. На нечарговым сходзе Беларускай грамады (снежань 1922 г.) П. Крэчэўскі быў выбраны ганаровым сябрам прэзідыума гэтай арганізацыі[8].

Пішучы да П. Крэчэўскага ў сярэдзіне студзеня 1923 г., Т. Грыб удакладняў некаторыя моманты наконт БНІ: «…адчыніць пры гэтым Беларускі Вучыцельскі Інстытут у Празе, з тым, каб пры змяніўшыхся абставінах перавесці яго ў край. Для інстытута прафесарскіх сіл не так-то шмат і патрэбна – тры-чатыры прафесары, а рэшта лектары і асістэнты. А гэта, бачыце, – таму што большасць лекцый студэнты могуць слухаць у Карлавым універсітэце. Нам-то трэба толькі добра абставіць беларусазнаўства». Акрамя таго, у тым самым лісце Т. Грыб піша аб прызнанні за П. Крэчэўскім кіруючай ролі па арганізацыі БНІ, а таксама аб бессэнсоўнасці знаходжання апошняга ў Коўне, бо «ўрад БНР перастаў быць ідэйным цэнтрам, не кажучы ўжо аб цэнтры арганізацыйным»[9].

Адказ старшыні Рады БНР быў катэгарычна адмоўным. У лісце да Т. Грыба, напісаным у канцы студзеня 1923 г., П. Крэчэўскі адзначае: «Няўжо ж ты думаеш, што для нашай незалежнасці карысней было б, каб я заняўся пачатковай школай, ды нават Пражскім універсітэтам? Гэта ж канец нашаму дзяржаўнаму і незалежнаму існаванню»[10].

Разумеючы, што верагоднасць пераезду П. Крэчэўскага ў Прагу невялікая, Т. Грыб усталёўвае сувязь з прафесарам Карлава ўніверсітэта Я. Ляцкім, які меў кантакты сярод чэхаславацкіх чыноўнікаў, адказных за рэалізацыю «Рускай акцыі». З'яўляючыся ўраджэнцам Беларусі, Я. Ляцкі вельмі прыязна ставіўся да розных беларускіх пачынанняў, пільна сачыў за жыццём землякоў. Ускосныя дадзеныя з ліставання Грыба сведчаць пра тое, што Я. Ляцкі згадзіўся прыняць удзел у стварэнні БНІ.

На пачатку 1923 г. ад імя Беларускай грамады быў пададзены мемарандум аб адкрыцці БНІ. У параўнанні з першапачатковым праектам быў цалкам зменены выкладчыцкі склад – у педагагічную раду БНІ ўвайшлі Я. Ляцкі (старшыня), В. Ластоўскі, Д. Дарашэнка. Невядомы звесткі пра тое, ці была атрымана згода Д. Дарашэнкі аб працы ў БНІ, але В. Ластоўскі адназначна не згадзіўся на пераезд у Прагу, нягледзячы на тое, што падчас сустрэчы восенню 1921 г. з Т. Грыбам выказаў жаданне пакінуць «ковенскае балота»[11]. Тым не менш В. Ластоўскі абраў больш надзейны для сябе варыянт і з вясны 1923 г. пачаў працу ў Беларускім цэнтры ў Літве, які быў заснаваны на базе зачыненага Міністэрства беларускіх спраў Літвы[12].

У сакавіку 1923 г. стала вядома аб адмоўным вырашэнні справы БНІ[13]. Прычынай непрыняцця беларускай просьбы было тое, што бюджэт дапамогі эмігрантам на першую палову 1923 г. быў ужо зацверджаны. Нягледзячы на няўдачу, Вяршынін «не губляў надзеі зрабіць інстытут не на гэты, але на наступны 1923/24 навучальны год», удакладняючы, што «калі не атрымаецца адчыніць толькі беларускі, то паспрабую беларуска-ўкраінскі»[14].

Падчас кампаніі па стварэнні БНІ беларуская калонія ў Празе знаходзілася на мяжы ідэалагічна-арганізацыйнага расколу. Супрацьстаянне паміж «левымі» і «правымі» прывяло да стварэння ў дру-

гой палове сакавіка 1923 г. Аб’яднання беларускага паступовага студэнцтва (АБПС)*. Раз’яднанасць дыяспары значна панізіла шансы на адкрыццё БНІ. Неабходна была кансалідацыя і ўзгодненая праца ўсёй дыяспары. Непаразуменні паміж старшынёй Беларускай грамады М. Вяршыніным і галоўным ідэолагам АБПС Т. Грыбам не дазволілі ім выпрацаваць агульную платформу адносна БНІ. Т. Грыб лічыў, што кіраўнічая роля ў будучым інстытуце павінна быць ускладзена на Я. Ляцкага. М. Вяршынін, наадварот, скептычна ставіўся да гэтай прапановы, разлічваў на стварэнне агульнага «беларуска-ўкраінскага інстытута». Пры такіх умовах, улічваючы пэўную напружанасць адносін паміж украінскай і рускай эміграцкімі групамі, наўрад ці быў магчымы ўдзел і дапамога Я. Ляцкага ў рэалізацыі «беларуска-ўкраінскага праекта». У выніку супрацоўніцтва Беларускай грамады з Я. Ляцкім фактычна прыпынілася. Гэта азначала фактычную бесперспектыўнасць далейшых спробаў па стварэнні БНІ.

Пасля «сакавіцкага расколу» 1923 г. галоўны ініцыятар стварэння і распрацоўшчык праекта БНІ Т. Грыб не меў магчымасці ўдзельнічаць на тым самым узроўні, што і раней, у працы па стварэнні БНІ. Да таго ж не вельмі карэктныя асабістыя ўзаемаадносіны паміж лідарамі і найбольш харызматычнымі прадстаўнікамі беларускай калоніі, а разам з тым і даволі спецыфічны характар самога Т. Грыба прывялі да пэўнага пераносу ідэі БНІ ў сферу асабістых звядзенняў рахункаў. Так, ужо пасля атрымання адмоўнага адказу наконт БНІ Я. Станкевіч у лісце да В. Ластоўскага адзначаў: «На жаль інстытуту ня будзе (а калі б і быў, ды ня з ласкі Грыба і Мамонькі)»[15].

Старшыня Беларускай грамады, у адрозненне ад Т. Грыба, быў куды менш апантаны ідэяй БНІ. М. Вяршынін па-ранейшаму працягваў займацца справай арганізацыі прыезду і ўладкавання заходнебеларускай моладзі на вучобу ў чэхаславацкія ВНУ. Улічваючы тое, што ніхто з «патэнцыйных беларускіх прафесараў» (П. Крэчэўскі, В. Ластоўскі, Я. Варонка і інш.) не надавалі БНІ значнай увагі і не збіраліся пераязджаць у Прагу, М. Вяршынін разумеў, што ўсе далейшыя захады будуць толькі марнаваннем часу. Таму хутчэй за ўсё ў далейшым ніякай актыўнай дзейнасці па стварэнні нават «беларуска-ўкраінскага» інстытута не праводзілася. У выніку ў сярэдзіне красавіка 1923 г. МЗС ЧСР асігнавала сродкі на стварэнне Украінскага вышэйшага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Драгаманава (УВПІ), а статут гэтай навучальнай установы афіцыйна зацвердзілі 4 траўня 1923 г.[16] Беларускія праекты так і засталіся толькі на паперы. Праўда, пазней пры УВПІ ўсё ж такі была заснавана кафедра беларусазнаўства.

Аналізуючы прычыны, якія не дазволілі стварыць БНІ, трэба ў першую чаргу адзначыць тое, што беларусы мелі значна меншы патэнцыял у параўнанні з рускай і ўкраінскай эміграцкімі групамі, сярод якіх было шмат аўтарытэтных і ўплывовых дзеячаў (былыя міністры, лідары палітычных партый, навукоўцы і г. д.). Чэхаславацкія ўлады лічыліся з іх пазіцыяй і патрабаваннямі. Да таго ж стварыць рускую ці ўкраінскую ВНУ было вельмі проста, бо ў Празе знаходзілася вялікая колькасць жадаючых атрымаць адукацыю з ліку рускай і ўкраінскай эміграцыі. Беларускую дыяспару складалі ж у асноўным стыпендыяты чэхаславацкага ўрада. Для мяркуемага БНІ студэнтаў-беларусаў у Празе не было. Толькі ў выпадку станоўчага вырашэння справы БНІ планавалася арганізаваць прыезд заходнебеларускай моладзі, што было вельмі складана і выклікала вялікае сумненне ў чыноўнікаў МЗС ЧСР.

Вызначальным момантам, які прадвызначыў лёс БНІ, з’явілася адсутнасць уласных выкладчыцкіх кадраў, а дакладней нежаданне прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху (напрыклад, П. Крэчэўскага, В. Ластоўскага) адысці ад палітычнай дзейнасці і ўключыцца ў працу па стварэнні ўласнага інстытута. «Пражскія» беларусы такой ролі выканаць не маглі, бо самі з’яўляліся студэнтамі ВНУ. Парадаксальна, але ў канцы 1923 г. прадстаўнікі ўрада БНР пераехалі ў Прагу, але час і магчымасці ўжо былі беззваротна згублены (з 1924 г. пачалося паступовае згортванне «Рускай акцыі»).

Нават з улікам усіх папярэдне абазначаных прычын магчымасць стварэння БНІ ўсё ж такі існавала. Сэнс такой стратэгіі заключаўся ва ўзгодненай дзейнасці ўсёй Беларускай грамады з максімальным задзейнічаннем уплываў і кантактаў Я. Ляцкага, але гэтага не адбылося. Беларуская дыяспара была раз’яднана і ідэалагічна, і арганізацыйна. М. Вяршынін і Т. Грыб не мелі практычна ніякіх уплываў у МЗС ЧСР. У выніку расколу беларускай дыяспары ў сакавіку 1923 г. Я. Ляцкі, які да гэтага часу быў згодны прыняць удзел у стварэнні беларускага інстытута, зразумеў, што наўрад ці магчыма будзе весці канструктыўную працу з прадстаўнікамі Беларускай грамады. Без яго падтрымкі ўсе шансы на стварэнне БНІ былі згублены.

Такім чынам, стварэння БНІ ў Празе не адбылося. Аднак само нараджэнне такой ідэі і спробы яе ўвасаблення, праведзеныя «пражскімі» беларусамі, заслугоўваюць увагі і добра ілюструюць тагачасны стан беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі, а разам з тым і беларускага нацыянальнага руху ўвогуле.

[1] Падрабязней гл.: Ляхоўскі У. Грамадска-культурная чыннасць беларускай дыяспары ў Чэхаславакіі ў 1921–1938 гг. // Грамадска-культурная чыннасць беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі. 1921–1938 гг. Мн., 2002. С. 21–31; Ляхоўскі У.

* АБПС – арганізацыя прыхільнікаў левасацыялістычнай ідэалогіі, якая існавала ў 1923–1924 гг. у Празе. У сваіх шэрагах аб’ядноўвала амаль палову «пражскай» беларускай калоніі. У кіраўніцтва Аб’яднання ўваходзілі В. Грышкевіч, Т. Грыб, І. Дварчанін, У. Жылка, В. Русак і інш.

Чэхія і беларускі вызвольны рух у першай трэці XX ст. // Białoruś w XX stoleciu. W kręgu kultury i polityki. Toruń, 2007. S. 491–522; Мирочицкий Л. Белорусское студенчество в эмиграции в Праге (20-е годы) // Русская, украинская и белорусская эмиграция в Чехословакии между двумя мировыми войнами: Сб. докл.: В 2 ч. Прага, 1995. Ч. 2. С. 826–832; Чмарава М. Шляхі ўзаемнага пазнання. Беларуская літаратура ў Чэхаславакіі ў 1920–1945 гг. Магілёў, 2004; Шабловская И. Белорусская эмиграция в Чехии и проблемы ее изучения // Русская, украинская и белорусская эмиграция в Чехословакии между двумя мировыми войнами: Сб. докл.: В 2 ч. Прага, 1995. Ч. 1. С. 29–41.

[2] Падрабязней гл.: Зубко В. Беларуская пражская эміграцыя і ўкраінскі педагагічны інстытут імя М. Драгаманава (1923–1933) // Кантакты і дыялогі. 2001. № 2-3. С. 14–17; Зубко О. Громадсько-культурна діяльність білоруської та української діаспор у Чехо-Словаччіні в 1921–1939 рр. // Дыяспара, культуралогія, гісторыя. Мн., 2006. С. 67–75; Ямкова В. Беларускае студэнцтва ва ўкраінскіх вышэйшых школах у Чэха-Славаччыне ў 1920–1930-я гг. // Спадчына. 2002. № 5-6. С. 109–121; Kolenovská D. Běloruská emigrace v Československu (1918–1939) // Soudobé déjiny. 2007. № 1. S. 78–93; Plavec M. Opatrné přešlavování: první kontakty československé a běloruské vlády 1918–1925 // Cesty k národnímu obrození: běloruský a český model. Praha, 2006.

[3] Гл.: Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. Р-5875. Воп. 1. Спр. 11.

[4] Гл.: Сладек З. Русская эмиграция в Чехословакии: развитие «Русской акции» // Славяноведение. 1993. № 4. С. 32; Dokumenty k dějinám ruské a ukrajinské emigrace v Československé republice (1918–1939). Praha, 1998. S. 19.

[5] Гл.: Дом в изгнании: Очерки о русской эмиграции в Чехословакии, 1918–1945. Прага, 2008. С. 9.

[6] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: У 2 т. Т. 1. Кн. 2: Ф. № 582 Дзяржаўнага архіва Літвы («Рада Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі»). Вільня; Нью-Ёрк; Менск; Прага, 1998. С. 1390.

[7] Гл.: ДАРФ. Ф. Р-5875. Воп. 1. Спр. 11. Л. 386 адв.

[8] Там жа. Л. 208 адв.

[9] Там жа. Л. 208–208 адв.

[10] Каленік У. Пражскій эпісталярый. Лісты Тамаша Грыба // Полымя. 1990. № 10. С. 206.

[11] Гл.: Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі… С. 1391.

[12] Гл.: Васілеўскі Ю. Беларускі цэнтр у Літве // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1993. Т. 1. С. 458.

[13] Гл.: ДАРФ. Ф. Р-5875. Воп. 1. Спр. 11. Л. 372 адв.

[14] Там жа.

[15] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі… С. 1395.

[16] Гл.: Мірний І. Український високий педагогичний інститут ім. М. Драгоманова (1923–1933). Прага, 1934. С. 5–6.

Паступіў у рэдакцыю 15.03.11.

***Андрэй Іванавіч Буча*** – аспірант кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян А.П. Салькоў.